сти к миру и ответственности за него составляет социальное и экологическое содержание православной педагогики. Понятия "долга" и "поступка" являются основными в православной педагогике. Таким образом, воцерковление воспитания понимается как условие спасения.


Литература, рекомендуемая при подготовке курса:

[1].Антология педагогической мысли Древней Руси и Русского государства XIV – XVII вв. - М., 1985.

[2].Антология педагогической мысли христианского средневековья: В 2 т. - М., 1994.

[3].Владимир, митрополит Киевский и Галицкий, священномученик. Азбука православного воспитания. - М., 1996.

[4].Вопросы православной педагогики. - М., 1992.

[5].Громыко М.М. Мир русской деревни. - М., 1991.

[6].Зеньковский В.В. Проблемы воспитания в свете христианской антропологии. - М., 1993.

[7].Зеньковский Василий, протопресвитер. Педагогика. - М., 1996.

[8].Ельчанинов Александр, священник. Записи. - М., 1992.

[9].Ильин А. А. Культурно-историческое значение подвига святых равноапостольных Мефодия и Кирилла, первоучителей словенских // Проблемы изучения русской литературы и традиции отечественной православной педагогики: Сб. материалов. - Тольятти, 1996. - С. 6-9.

[10].Иоанн (Крестьянкин), архимандрит. О воспитании детей. - М., 1996.

[11].Коломзина С.С. Наша Церковь и наши дети. - М., 1993.

[12].Меньшиков В.М. Православная вера в педагогическом учении Ушинского // К.Д.Ушинский и русская школа: Беседы о Великом педагоге. - М., 1994. - С. 70-81.

[13].О целомудрии. - М., 1996. (Общедоступная православная библиотека.)

[14].Опыты православной педагогики / Сост. А.Стрижев и С.Фомин. - М., 1993. - (Литературная учеба. 1993. Кн. 5, 6.)

[15].Пестов Н.Е. Путь к совершенной радости: воспитание детей. - М., 1995.

[16].Пестов Н.Е. Современная практика православного благочестия: опыт построения христианского миросозерцания. - СПб., 1995-1996. - Т. 1-4.

[17].Серяков А.А. Из воспоминаний о С. А. Рачинском // Традиции. Культура. Образование: Науч. сб. - М., 1996. - Вып. 2. - С. 27-35.

[18].Сурова Л.В. Православная школа сегодня. - Владимир, 1996.

[19].Тасалов А.В. Учителю о православии /Псков. Ин-т повышения квалификации работников образования; Пед. центр рус. культуры. - Псков, 1994.

[20].Феофан Затворник, святитель. Начертание христианского нравоучения. - М., 1994. - Т. 1-2.

[21].Христианское воспитание детей: Репринт. изд. - М., 1993.

[22].Шестун Евгений, священник. Православная педагогика. - Самара, 1998.



**Б.А.Лазука**


## АДУКАЦЫЙНАЯ СІСТЭМА БЕЛАРУСІ ЭПОХІ БАРОКА

У XVII - XVIII стст. адзначаецца некалькі напрамкаў развіцця сістэмы адукацыі і асветы грамадства. Дынаміка іх існавання не ўяўляе паслядоўнай змены формаў, а таму ацэнка канкрэтных з'яў не можа быць адназначнай. Кожны напрамак вызначае або дае пачатак пэўнай адукацыйна-асветніцкай форме і атрымлівае пашырэнне ў наступныя часы. Разам з тым не ўсе састаўныя часткі сістэмы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыі і асветы XVII - XVIII стст. уяўляюць нешта прынцыпова адметнае ад сярэдневяковай ці рэнесанснай эпох. Пытанні зместу адукацыйных сістэм эпохі мы будзем закранаць у той ступені, у якой гэта будзе неабходна для высвятлення абставін развіцця мастацкай практыкі. У адукацыйнай сістэме Беларусі эпохі барока можна вызначыць чатыры дамінуючыя напрамкі.

Першы звязаны з працягам існавання склаўшыхся формаў арганізацыі адукацыі. Яго аснову складае цэх. Гісторыкамі ўстаноўлена, што праходжанне вучнёўства ў цэху было абавязковым і строга рэгламентавалася. Працягвалася яно даволі доўга. У дакументальных крыніцах указваюцца розныя тэрміны, але часцей за ўсё ад трох да пяці гадоў. Аднак вядомы статуты некаторых цэхаў, дзе тэрмін вучнёўства вызначаўся дзесяццю гадамі[1]. Існаванне такога разыходжання можна растлумачыць характарам прафесійных навыкаў, якія павінен быў атрымліваць вучань. У тых выпадках, калі род будучых заняткаў, спецыфіка працы не патрабавалі глыбокіх і рознабаковых ведаў, час вучнёўства быў невялікі. Прафесіі, напрыклад, злотнікаў, збройнікаў, друкароў, дактароў, фельдшараў, скульптараў-лепшчыкаў, мастакоў прадугледжвалі валоданне шматлікімі навыкамі ў самых разнастайных сферах вытворчасці, што патрабавала павелічэння часу вучнёўства. У канчаткова сфарміраванай цэхавай сістэме майстар-рамеснік павінен быў прайсці шлях ад вучня да падмайстра. Толькі праз гэтыя дзве ступені ён мог набыць статус паўнапраўнага рамесніка, прэтэндаваць на ўступленне ў цэх, адкрываць сваю майстэрню, набіраць вучняў. У беларускіх цэхавых статутах зафіксавана яшчэ адна ступень вучнёўства - паўпадмайстар, якога часта называлі “пахолік”, “пахолак”, “робенік”, “млоденец”[2].

Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што вучнем рамесніка мог стаць свабодны чалавек, а вучнёўства яго павінна было праходзіць толькі ў аднаго майстра. Пераход, асабліва па жаданні вучня, забараняўся. Калі ўсё ж такі гэта здаралася, то толькі ў сувязі з надзвычайнымі абставінамі. Паказальным з’яўлялася таксама рэгламентацыя атрымання падмайстрам статуса майстра. Акрамя вызначанага тэрміну вучнёўства, прэтэндэнту неабходна было выканаць пробную работу ("шэдэўр") і зрабіць вандроўку з мэтай удасканалення і пашырэння свайго прафесійнага майстэрства[3]. Прычым вандроўка звычайна праходзіла па некалькіх, даволі аддаленых гарадах, але часцей за ўсё ў межах Рэчы Паспалітай.

Прыведзеныя факты сведчаць аб наяўнасці ў рамесным асяроддзі пэўных правіл набыцця прафесійных ведаў. Адукацыйны працэс будаваўся па прынцыпе сумеснай працы побач з майстрам. Ва ўмовах павелічэння пазнавальных запатрабаванняў вучняў, неабходнасці пастаяннага ўскладнення тэхнічнай дасканаласці

рамесніцкіх вырабаў, адкрыцця і ўвядзення новых прыёмаў апрацоўкі матэрыялаў і тым больш у сувязі з усталяваннем новых спосабаў адлюстравання рэчаіснасці ў творах мастацтва дазвалялася перадаваць не толькі практычныя навыкі, але і адукацыйныя. Навуковыя веды, культура і вытворчасць не толькі суіснавалі, але і абумоўлівалі адно аднаго.

Другі напрамак развіцця сістэмы адукацыі і асветніцтва ў XVII - XVIII стст. акрэслены дзейнасцю разнастайных арганізаваных формаў, звязаных з канфесійным і эканамічным падзелам грамадства[4]. Цікавасць у гэтым сэнсе выклікаюць брацтвы. Першыя звесткі аб іх адносяцца да сярэдзіны XVI ст. Гэтыя аб'яднанні ствараліся пры манастырах, цэрквах, касцёлах, кляштарах, цэхах[5]. Сфера дзейнасці брацтваў была даволі шырокай. У іх вырашаліся самыя розныя пытанні, у тым ліку рэлігіі, палітыкі, эканомікі, культуры, асветы, адукацыі. У склад брацтваў маглі ўваходзіць людзі розных прафесій і сацыяльнага становішча, але адзінага веравызнання[6]. У межах разглядаемай праблемы асаблівай увагі заслугоўваюць брацкія школы. Развіццё рамёстваў выклікала неабходнасць падрыхтоўкі адукаваных майстроў, здольных ведаць не толькі сакрэты сваёй прафесіі, але і шэраг сумежных з ёю: юрыдычных, вытворча-арганізацыйных, гандлёвых. Традыцыйны варыянт, калі вучань атрымліваў веды ад працуючага побач майстра, пачынае незадавальняць надзённым патрэбам, што і выклікае неабходнасць стварэння сеткі школ, даступных самым розным колам насельніцтва.

Важнай прычынай узнікнення брацтваў і брацкіх школ з'яўляецца фарміраванне апазіцыі афіцыйнай палітыцы ўрада і арыстакратычных колаў, супраціўленне або садзейнічанне распаўсюджанню уніі, каталіцызму і Контррэфармацыі[7]. Пашырэнне брацкіх школ на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага пачынаецца з канца XVI ст.: у Вільні яны ўзнікаюць у 1584 г., у Брэсце ў 1591 г., у Мінску ў 1592 г., у Магілёве ў 1597 г., у Полацку ў 1633 г., у Оршы ў 1648г.[8]. Узровень выкладання ў іх быў даволі высокім. Як адзначае С.Падокшын, "веды, атрыманыя вучнямі некаторых пратэстанцкіх і праваслаўных брацкіх школ, былі дастатковымі для паступлення ў заходнееўрапейскія універсітэты"[9]. Асаблівая ўвага ў брацкіх школах надавалася выкладанню моў (у праваслаўных школах звычайна выкладаліся лацінская, стараславянская, польская; у каталіцкіх - лацінская, беларуская), арыфметыкі, Свяшчэннага Пісання, царкоўных спеваў.

Выкладчыкамі брацкіх школ часта былі вядомыя сваёй навуковай, грамадскай, педагагічнай дзейнасцю людзі, як, напрыклад, Сімяон Полацкі, Філафей Утчыцкі, Ігнацій Іяўлевіч, Лявонцій Карповіч. Гэта дае падставу сцвярджаць, што існаванне брацкіх школ на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага адыграла важную ролю ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцці сістэмы адукацыі, распаўсюджанні асветніцтва, аб'яднанні прадстаўнікоў розных грамадска-канфесійных кірункаў, выпрацоўцы пэўных напрамкаў у свецкай і царкоўнай сферах жыцця грамадства[10].

Нямалаважнае значэнне мелі таксама кальвінскія і каталіцкія вучылішчы (Гродна, Масты, Вільня), школы арыянскіх абшчын (Клецк, Нясвіж, Навагрудак, Іў'е, Любча). Аднак роля іх была абмежавана адносна невялікай колькасцю, кароткім тэрмінам функцыянавання. Трэба адзначыць, што брацкія школы, кальвінскія і каталіцкія вучылішчы, школы арыянскіх абшчын уяўлялі ніжэйшую ступень адукацыі. Яны былі разлічаны на вучняў з малазаможных ці бедных сямей шляхты і мяшчан.

Нараджэнне і развіццё новых формаў адукацыі разглядаемага перыяду адбылося ў сувязі з дзейнасцю ордэнаў езуітаў, піяраў, дамініканцаў. Навучальныя ўстановы, якія засноўваліся і ўтрымліваліся гэтымі ордэнамі, з'явіліся важнымі асяродкамі распаўсюджання навукі, культуры, асветы. Царква і свецкая ўлада ўяўлялі адказнасць канфесійнай барацьбы, дастаткова вострай і бескампраміснай у разглядаемы перыяд. І хаця расстаноўка сіл не была роўнай, а перавага належала каталіцкай і уніяцкай цэрквам, неабходнасць і важнасць умацавання сваіх пазіцый разумелася з усёй прынцыповасцю і сур'ёзнасцю. Разам з тым адкрыццё ведаў перад усімі амаль у роўнай ступені, свядомае стаўленне да Свяшчэннага Пісання мела пад сабой рэальную пагрозу манаполіі царквы на ісціну. Менавіта таму ў навучальных установах каталіцкіх і уніяцкіх ордэнаў велізарнае значэнне надавалася не столькі колькаснаму накапленню ведаў, колькі спосабам іх перадачы, выхаванню асобы, прычым у межах тых патрабаванняў, з арыентацыяй на вырашэнне тых задач, якія былі б карысны царкве.

Найбольшым пацверджаннем гэтай пазіцыі з'яўляецца праца ордэна езуітаў. Яго дзейнасць на тэрыторыі Беларусі пачалася з канца XVI ст.[11], з заснавання калегій, якія аб'ядноўвалі місіі. У месцах размяшчэння калегій - буйных гарадах, прамыслова-рамесніцкіх, гандлёвых і культурных цэнтрах, такіх як Брэст, Віцебск, Гродна, Мінск, Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Слуцк, - адчыняліся і навучальныя ўстановы ордэна - калегіумы. У асноўным яны былі пяцікласнымі, аднак тэрмін навучання ў некаторых класах мог працягвацца два, тры ці чатыры гады. Першы тып - гэта пяцікласная лаціна-грэчаская школа з трыма класамі граматыкі, адным паэтыкі і адным рыторыкі. Другі тып утварае ўжо названая пяцікласная лаціна-грэчаская школа з дадатковым курсам філасофіі, які вывучаўся тры гады. Нарэшце трэці тып - гэта пяцікласная школа з трохгадовым курсам філасофіі і чатырохгадовым курсам тэалогіі. Менавіта апошні з названых тыпаў школ мог мець правы акадэміі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя звычайных школ, пры калегіумах існавалі семінарыі, у якіх рыхтавалі малодшы і сярэдні клір, і настаўніцкія семінарыі, выпускнікі якіх мелі права выкладаць у малодшых класах названых школ. У семінарыях і настаўніцкіх семінарыях выкладаліся курсы філасофіі і тэалогіі.

Існуе погляд, адпаведна якому езуіцкія навучальныя ўстановы ацэньваюцца адмоўна як цэнтры, адукацыя ў якіх была скіравана на патрэбы каталіцкай царквы, ордэна езуітаў, як асяродкі што насаджалі "рэлігійны фанатызм"[12], прыніжалі асобу, фарміравалі ў яе свядомасці абмежаваныя ўяўленні аб свеце, спрошчаныя ацэнкі рэчаіснасці. Але факты сведчаць аб неабходнасці дыферэнцыраваных адносін да дзейнасці як самога ордэна, так і яго навучальных устаноў. У калегіумах выкладаліся матэматыка, гісторыя, геаграфія (у 30—40-х гг. XVIII ст. яе, як самастойны прадмет, увёў К.Бартольц), лацінская, грэчаская, нямецкая, французская, польская і руская мовы, філасофія, тэалогія, паэтыка, рыторыка, міфалогія. Вучні атрымлівалі грунтоўныя музычныя веды (пры кожным калегіуме мелася музычная бурса), іх вучылі плаванню, верхавой яздзе, фехтаванню, харэаграфіі, акцёрскаму майстэрству. Нават гэты пералік паказвае, што вучэбны працэс, яго арганізацыя і змест былі безумоўна свецкімі. Дзейнасць езуіцкіх калегіумаў будавалася на прыкладзе заходнееўрапейскіх універсітэтаў. Як адзначае Б.Натоньскі, езуіты не стварылі новай сістэмы адукацыі, а толькі ўдасканалілі і прыстасавалі для сваіх патрэб метады навучання і выхавання, што існавалі на той час[13]. У калегіумах выкладалі вучоныя, філосафы і пісьменнікі з еўрапейскім імем, такія як А.Алізароўскі, М.Быстрыцкі, Б.Дабшэвіч, А.Нарушэвіч, М.Пачобут-Адляніцкі, М.Сарбеўскі, а выпускнікі гэтых навучальных устаноў на працягу другой паловы XVII - канца XVIII ст. вызначалі галоўныя кірункі грамадска-палітычнага, канфесійнага жыцця ў дзяржаве. Дзейнасць калегіумаў аказвала станоўчы ўплыў і на саму каталіцкую царкву, ордэн езуітаў, што можна заўважыць па росце колькасці святароў, якія мелі вучоныя ступені. Так, калі ў 1628 г. у Літоўскай правінцыі ордэна было 5 дактароў тэалогіі, 9 магістраў філасофіі, то ў 1649 г. налічвалася 13 дактароў тэалогіі, 13 дактароў і магістраў філасофіі, 4 магістры мастацтваў. У гэтых адносінах становішча ордэна езуітаў у Кароне значна адрознівалася. Тут у 1625 г. было 3 дактары тэалогіі і 6 магістраў філасофіі і мастацтваў, а ў 1649 г. толькі 1 доктар тэалогіі і 1 ліцэнцыят права. Гісторыкі звязваюць гэта з дзейнасцю буйнейшай навучальнай установы ордэна ў Вялікім княстве Літоўскім - Віленскай акадэміяй - і адсутнасцю навучальнай установы аналагічнага ўзроўню ў Польшчы[14].

На тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага назіраецца рост колькасці калегіумаў з пачатку іх заснавання ў канцы XVI ст. да спынення дзейнасці ордэна на тэрыторыі Расійскай імперыі ў 1820 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэта былі навучальныя ўстановы, даступныя самым шырокім слаям насельніцтва. У іх мелі права паступаць не толькі дзеці шляхты, але і мяшчан, нават сялян. Пераважная большасць калегіумаў утрымлівала шпіталі, аптэкі, прытулкі для беднякоў[15]. Наяўнасць вялікіх бібліятэк і разнастайных кнігазбораў сведчыць аб тым, што гэта былі буйнейшыя культурныя цэнтры. Нарэшце адзначым, што пры калегіумах функцыяніравалі тыпаграфіі, тэатры[16].

Усё адзначанае не пакідае сумненняў у тым, што езуіцкія навучальныя ўстановы ў разглядаемы перыяд з'яўляліся важнымі асяродкамі распаўсюджання культуры, адукацыі. Іх дзейнасць у часы заняпаду і пад'ёму эканомікі, крызісу і актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця адрознівалася стабільнасцю і высокім навуковым узроўнем. Прытрымліванне калегіумамі гуманітарнага кірунку, іх безумоўная свецкая арыентацыя аказала ўздзеянне на развіццё тагачаснай культуры, палітычнай, этычнай, філасофскай думкі ва ўсім грамадстве. Нарэшце езуіцкія навучальныя ўстановы задавальнялі патрэбы ў адукацыі самых шырокіх мас шляхты, мяшчан, стаўшы амаль на два стагоддзі асноўнымі цэнтрамі асветы[17].

Характар і асаблівасці гістарычнай сітуацыі ў Вялікім княстве Літоўскім, як і яе ўздзеянне на культуру нельга ўявіць без яшчэ двух напрамкаў, па якіх ішло развіццё асветы ў грамадстве, - прыватнай і замежнай. Без іх разгляду немагчыма зразумець не толькі адметнасць і ўзровень тагачаснай адукацыі, але і вельмі важныя прыярытэты ў сферы культуры, шляхі міждзяржаўных узаемасувязяў. Названыя напрамкі развіцця адукацыі не адлюстраваліся ў канкрэтных праграмах, статутах, іншых дакументальна зафіксаваных формах. Аднак уяўленне аб іх можна атрымаць па прыватнай перапісцы, дзённіках, успамінах.

Важна падкрэсліць, што атрыманне адукацыі пры хатнім выхаванні, як і навучанне ва універсітэтах Заходняй Еўропы, было прывілеем заможных слаёў грамадства - магнатэрыі, сярэдняй шляхты і мяшчан. Пры гэтым выбар асоб, на якіх ускладваліся абавязкі выхавацеля і настаўніка, абумоўліваліся адукацыяй, прыватнымі рысамі ўкладу, традыцыйнага для таго ці іншага сацыяльнага слою. Але як ні ацэньваць гэтую акалічнасць, нельга не ўлічваць і канфесійную прыналежнасць наймальнікаў хатніх настаўнікаў, нарэшце пануючыя і хутка зменлівыя ўздзеянні моды на спосабы культурнага задавальнення інтарэсаў эліты.

Мэтазгодна падкрэсліць таксама цесную ўзаемасувязь прыватнай і замежнай адукацыі (асабліва прыватнай) з тымі арганізаванымі формамі, якія існавалі ў XVII – XVIII стст. у дзяржаве. Як прыклад, можна прывесці распаўсюджаную традыцыю запрашаць у якасці настаўнікаў і выхавацеляў выпускнікоў навучальных устаноў, што ўтрымліваліся каталіцкай, уніяцкай і праваслаўнай цэрквамі, або



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

колішніх студэнтаў, слухачоў буйных універсітэтаў Еўропы. Так, Р.Адам (1602-1656?), рэктар Слуцкай кальвінскай школы, аўтар яе статута "Ordo scholae Slucenses" (1622), выпускнік Лейдэнскага універсітэта, быў настаўнікам Я.Радзівіла, будучага вялікага гетмана літоўскага. Ён жа суправаджаў свайго вучня за мяжу, калі той наведваў універсітэты Лейдэна і Альтдорфа, а потым займаў пасаду прыдворнага прапаведніка Я.Радзівіла. Справы выхавання дзяцей Радзівілаў даручаліся П.Дзмітровічу (?-1641), былому слухачу універсітэтаў Франкфурта-на-Одэры, Гейдэльберга, Інгальштата, Альтдорфа (вучыў дзяцей І.Радзівіла), Д.Наброўскаму (1573-1640), выпускніку універсітэтаў Вітэнберга, Базеля, Арлена (вучыў дзяцей віленскага ваяводы К.Радзівіла), Я.Пашкоўскаму (1684-1757), выпускніку Віленскай акадэміі (вучыў дзяцей М.К.Радзівіла Рыбанькі), С.Богуш-Сестранцэвічу (1731-1826), слухачу курсаў універсітэтаў Кёнігсберга (Круляўца), Франкфурта, Амстэрдама, Лондана. Буйнымі філосафамі, гісторыкамі, педагогамі, пісьменнікамі былі настаўнікі дзяцей віленскага ваяводы Я.Гільзена (К.Вырвіч, 1717-1793, скончыў Пінскі, Дынабургскі калегіумы, Віленскую акадэмію), надворнага маршалка Вялікага княства Літоўскага Сцыпіна дэ Кампа (М.Догель, 1715-1760, займаўся ва універсітэтах Лейпцыга і Парыжа), падскарбія надворнага літоўскага, гродзенскага старасты А.Тызенгаўза (Ф.Богуш, 1746-1820, выпускнік Віленскай акадэміі).

Сярэдняя шляхта таксама звярталася да паслуг хатніх настаўнікаў. Аднак у поле яе зроку хутчэй за ўсё траплялі выпускнікі калегіумаў або іншых навучальных устаноў не вельмі высокага рангу. Гэтыя людзі не толькі адпавядалі ментальнасці, густам, уяўленням аб адукаванасці шляхты, але і неслі тыя веды, сістэмы ацэнак з'яў рэчаіснасці, якія маглі быць успрынятымі дадзеным саслоў'ем. Іх перавагай сярод хатніх настаўнікаў можна растлумачыць у некаторай ступені пашырэнне і вялікую жывучасць сармацкага светапогляду ў пэўнай часткі грамадства, зліццё традыцыйнага спосабу жыцця з сакральнымі канцэпцыямі.

Хатняе выхаванне, асабліва ў XVIII ст., атрымала настолькі шырокае распаўсюджанне, што пачало выклікаць занепакоенасць у некаторых прадстаўнікоў навуковых колаў. Так, педагог і філосаф А.Барташэвіч у сваіх прамовах (1759) выказваў думку, што хатняе выхаванне фарміруе адмоўныя адносіны моладзі да навукі і школы, што рэфармаваныя езуіцкія навучальныя ўстановы даюць больш грунтоўныя і шырокія веды[18]. Аднак калі разглядаць хатняе выхаванне як частку грамадскага і культурнага жыцця дзяржавы, можна адзначыць, што яно выконвала своеасаблівыя аб'ядноўваючыя функцыі. Свет магнацкага палаца, шляхецкай сядзібы або дома заможнага купца быў набліжаны ( у большай ці меншай ступені, на самой справе ці толькі як даніна модзе) да свету навукі, сапраўдных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведаў. Навучальныя ўстановы таго часу не існавалі ізалявана, а іх выхаванцы папаўнялі не толькі групы дзяржаўных чыноўнікаў, сярэдняга кліру. Яны здзяйснялі практычныя задачы, фарміруючы вызначаныя маральныя, светапоглядныя ўстаноўкі ў грамадстве. Гэта была тая сфера, якую ў абставінах амаль няспынных войн, спаборніцтваў магнацкіх груповак, заняпаду гаспадаркі хацелася б бачыць адной з самых важных і неабходных і якую нельга не разглядаць пры аналізе ўмоў культурнага жыцця XVII-XVIII стст.

У складанай і дастаткова разгалінаванай сістэме адукацыі не апошняе месца адыгрывала магчымасць асобы атрымаць веды ў замежных універсітэтах. Факты сведчаць, што і малазаможным слаям была даступна гэта форма навучання. Ва ўсялякім разе такое права, зафіксаванае ў Статуце Вялікага княства Літоўскага, распаўсюджвалася на ўсіх свабодных людзей дзяржавы незалежна ад нацыянальнасці[19]. Традыцыя ад'язжаць за мяжу з мэтай атрымання адукацыі сфарміравалася яшчэ ў часы Адраджэння[20]. Яна значна пашырылася ў XVII - XVIII стст., што было абумоўлена ўскладненнем міжнацыянальных і міждзяржаўных зносін, палітычнымі і гандлёвымі сувязямі, наяўнасцю некалькіх канфесій, нарэшце, большай адкрытасцю грамадства – з'явай, характэрнай для Новага часу. Часта на тых, хто атрымаў адукацыю ў замежных універсітэтах і ўстанавіў некаторыя неафіцыйныя сувязі з грамадска-палітычнымі коламі еўрапейскіх краін, ускладваліся адказныя дыпламатычныя задачы.

Геаграфія вучэбных цэнтраў Заходняй Еўропы, найбольш папулярных у XVII - XVIII стст., была дастаткова шырокай – Лейдэн, Альтдорф, Кёнігсберг (Крулявец), Рым, Лондан, Парыж, Амстэрдам, Лейпцыг, Кракаў, Гамбург, Ліён, Прага, Вюрцбург. Пераважна гэта былі універсітэты Германіі, Францыі і Італіі. Мастацкую адукацыю найчасцей імкнуліся атрымаць у Дрэздэне, Парыжы і Рыме. Выбар навучальных устаноў абумоўліваўся некалькімі прычынамі - старажытнасцю і прэстыжнасцю універсітэта, грунтоўнасцю ведаў, якія там можна было набыць, нарэшце палітычнымі зносінамі, што існавалі на той момант з дадзенай дзяржавай. Перавага навучальных устаноў Германіі, Францыі, Італіі тлумачыцца і пануючымі ў Рэчы Паспалітай арыентацыямі на заходнееўрапейскія культурныя традыцыі.

1 Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губернии Витебской и Могилевской, хранящиеся в центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией и.д. архивариуса сего архива М.Веревкина. - Витебск, 1877. - Вып.8. - С. 292, 288, 434, 488; Нацыянальны архіў Беларусі ў г.Гродне, ф. 1348, воп. 1, с. 1, л. 135, 244.

2 Белорусский архив. - Мн., 1930. - Т.3. - С.160, 219 - 221.

3 У статуце мінскага цэха металістаў (1591) адзначаецца, што злотнікам трэба зрабіць "шэдэўр" (пробную работу), якая пацвярджала б узровень прафесійнага майстэрства рамесніка: "А, менавіта, той, хто пажадаў запісацца ў цэх злотнікам, павінен зрабіць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наступныя шэдэўры: двайны кубак, персцень з адным або некалькімі каштоўнымі камянямі, як робяць у Вільні" (Хрестоматия по истории Белоруссии с древнейших времен до 1917 г. - Мн., 1977. - С.48).

[4] Lukaszewicz J. Historia szkol w Koronie i Wielkim ksestwe Litewskim od czasow naidawniejszych az do roku 1794. - Poznan, 1848. - T.1.

[5]Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею для разбора древних актов. - Вильна, 1895 - 1915, 1865. - Т.1-39. - С.222 – 224.

[6] Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Мн., 1996. - Т.2. - С.399; Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. - Мн., 1972, - Т.1. - С. 239 - 242; Краменко М. Западнорусские церковные братства, их происхождение и значение. Киев, 1913; Попков А.А. Братства: Очерк истории западнорусских православных братств. - СПб., 1900.

[7] Ісаевіч Я.Д. Братства та їх роль в розвитку української культури XVI – XVIII стст. - Київ, 1966; Исаевич Я.Д. Роль братств в издании и распространении книг на Украине и Белоруссии (конец XVI – XVIII в.)// Книга и графика. - М., 1972; Ломцеў Т. Брацтвы ў гісторыі нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага народа// Бальшавік Беларусі. - 1945. - №3.

[8] Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Мн., 1996. - Т.2. - С.398 - 399; Гісторыя БССР: У 2 т. - Мн., 1961. - Т.1. - С.142 - 143.

[9] Падокшын С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. - Мн., 1990. - С.28; Харлампович К.В. Западнорусские православные школы XVI и начала XVII века, отношение их к инославным, религиозное обучение в них и заслуги в деле защиты православной веры и церкви. - Казань, 1889.

[10] Бригадина О.В., Бригадин П.И. О роли братских школ в развитии Просвещения в Белоруссии // Славяне: адзінства і мнагастайнасць: Тэз. дакл. і паведамленняў міжнар. канф. 24-27 мая 1990 г. Матэрыялы 3-й секцыі "Гуманізм і асветніцтва ў славянскіх культурах". - Мн., 1990. - С.4 - 5.

[11] Митрошенко И.Я. Иезуиты в восточной части Белоруссии с 1579 по 1772 год // Полоцко-Витебская старина. - Витебск, 1912. - Вып.2. - С.2.

[12] Блинова Т.Б. Иезуиты в Белоруссии. - Мн., 1990. - С.23 - 27; Яе ж. - Орден иезуитов в Белоруссии – крупный вотчинник и эксплуататор народных масс (1570-1774 гг.): Автореф. дис… канд. ист. наук. - Мн., 1979.

[13] Natonski B. Szkolnictwo jezuickie w Polsce w dobie kontrreformacji // Wiek XVII. Kontrreformacja. Barok. Prace z historii kultury. - Wroclaw; Warszawa; Krakow, 1970. - S.310.

[14] Тамсама. - S.316 - 317.

[15] Губер Ж. Иезуиты: их история, учение, организация и практическая деятельность в сфере общественной жизни, политики и религии. - СПб., 1898; Демьянович А. Иезуиты в Западной России, 1569 – 1772. - СПб., 1872. - С.45.

[16] Барышев Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII века. - Мн., 1992 .- С.16; Lewanski J. Teatry szkolne w czasach poprzedajacych poczatek dzialalnosci Teatru Narodowego // Teatr narodowy w dobie Oswiecenia. - Wroclaw, 1967.

[17] Bienkowska B., Bienkowski T. Kierunki recepcji nowozytnej mysli naukowej w szkolach polskich (1600-1773). Cz.11. Humanistyka. - Warszawa, 1976. - S.43 - 44.

[18] Бирало А.А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII - середине XVIII века. - Мн., 1971. - С.127.

[19] Статут Вялікага княства Літоўскага. 1580. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. - Мн., 1989. - С.119 - 120.

[20] Галенчанка Г.Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. - Мн., 1993. - С.47 - 48; Яго ж. Студенты Великого княжества Литовского в Краковском университете в XV – XVI вв. // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в. - М., 1976. - С. 228 - 240; Грицкевич В.П. Путешествия наших земляков: из истории страноведения Белоруссии. - Мн., 1968.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ